# Антыкарупцыйная палітыка

Антыкарупцыйная палітыка УП “Мінскводаканал” накіравана на прадухіленне карупцыі і захаванне норм антыкарупцыйнага заканадаўства кіраўніцтвам, работнікамі і іншымі асобамі, якія могуць дзейнічаць ад імя прадпрыемства.

**Мэты:**

- мінімізаваць рызыку ўцягвання УП “Мінскводаканал”, кіраўніцтва і работнікаў прадпрыемства ў карупцыйную дзейнасць;
- сфарміраваць у контрагентаў, работнікаў і іншых асоб аднастайнае разуменне палітыкі УП “Мінскводаканал” аб непрыняцці карупцыі ў любых яе формах і праявах;
- абагульніць і растлумачыць асноўныя патрабаванні антыкарупцыйнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь;
- устанавіць абавязак супрацоўнікаў УП “Мінскводаканал” ведаць і выконваць прынцыпы і патрабаванні Палітыкі, ключавыя нормы дзейнага антыкарупцыйнага заканадаўства.

**Прынцыпы:**

- непрынятце карупцыі ў любых формах і праявах пры ажыццяўленні паўсядзённай дзейнасці УП “Мінскводаканал”;
- перыядычная ацэнка карупцыйных рызык, характэрных для дзейнасці прадпрыемства ў цэлым і для асобных напрамкаў у прыватнасці;
- падтрыманне дасведчанасці работнікаў у пытаннях антыкарупцыйнай палітыкі і прымянення яе на практыцы;
- адмова ад мер у адказ і санкцый, калі работнік прадпрыемства паведаміў аб меркаваным факце карупцыі ў любой яе форме.

**Адказнасць за невыкананне:**

Кіраўніцтва прадпрыемства і работнікі ўсіх структурных падраздзяленняў нясуць адказнасць, прадугледжаную заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і могуць быць прыцягнуты да адказнасці па ініцыятыве прадпрыемства, праваахоўных органаў або іншых асоб у парадку і на падставах, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, Статутам і іншымі нарматыўнымі актамі.

Дырэктар /*подпіс*/ А.А.Аўруцін

“16” мая 2017 г.

Вытрымка з Антыкарупцыйнай палітыкі
УП “Мінскводаканал” ад 16.05.2017 г.